Предлагаемые задания детям с ЗПР со сложными конструкциями и длинной последовательностью часто забываются. Ограниченная возможность для развития когнитивной сферы является причиной низкой активности образной памяти.

Образная память дошкольников с задержкой психического развития имеет узкий объем запоминаемого материала, сниженную точность воспроизведения образных конструкций, а также имеются затруднения при отсроченном воспроизведении материала, повторение одних и тех же элементов.

Основными технологиями развития образной памяти у дошкольников с ЗПР являются: визуализация, пиктограммы, метод Цицерона, методика Глена Домана, методика Монтессори.

Существует большое количество игр, на развитие образной памяти. Мы хотим более подробно остановиться на такой игре как «мемори». Данная игра, в первую очередь, направлена на развитие различных видов памяти у дошкольников с различными нарушениями разития. Такие игры на память направлены на стимулирование зрительного восприятия. В сочетании с предметной деятельностью они способствуют более динамичному развитию различных познавательных психических процессов: образной памяти, внимания, а также у детей появляется заинтересованность. Кроме развития образной памяти у детей формируется положительная мотивация к овладению устной речи. Использование дидактических игр «Мемори» можно считать эффективными. Дети начинают активно участвовать в игровой деятельности, учатся договариваться между собой, правильно выполнять задания, в соответствии с правилами игры. У детей есть интерес к созданию собственных дидактических игр, в зависимости от предложенной темы, с использованием различных материалов. Данные игры способствуют поддержке детской инициативы дошкольников во время игровой деятельности. Игры «мемори» можно успешно использовать во время организованных учебных мероприятий, а также в самостоятельной деятельности детей.

**Заключение.** Таким образом, проанализировав литературные источники, можно сделать вывод о том, что дети с задержкой психического развития имеют особенности в развитии памяти от детей с нормативным развитием, по всем характеристикам этого когнитивного процесса. Можно выделить следующие отличительные черты: непроизвольное запоминание развито недостаточно, методы смыслового запоминания снижены, недостаточная активность мнемической деятельности, которая проявляется в снижении усилий по припоминанию заученного материала, недостаточная точность в воспроизведение заученного материала, снижение вербальной и образной памяти.

1. Власова, Т.А. О детях с отклонениями в развитии / Т.А. Власова, М.С. Певзнер. – М.: Просвещение, 1973. – 89 с.
2. Новиков, А.М. Педагогика: словарь системы основных понятий / А.М. Новиков. – М.: ИЦ ИЭТ, 2013, – 268 с.
3. Щербакова, А.М. Воспитание ребенка с нарушениями развития / А.М. Щербакова. – М.: НЦ ЭНАС, 2002. – 40 с.

## ВЫКАРЫСТАННЕ ІЛЮСТРАЦЫЙНАГА МАТЭРЫЯЛУ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ У ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

***Грыцук М.Э.,***
*студэнтка 4 курса УА "БрДУ імя А.С. Пушкіна", г. Брэст, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Канцавая Г.М.,** канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Ілюстрацыйны матэрыял, мастацкі твор, малодшыя школьнікі, літаратурнае чытанне.
Keywords. Illustrative material, artwork, junior schoolchildren, literary reading.

Тэрмін *ілюстрацыя* мае значэнне 'малюнак у кнізе, часопісе, які суправаджае тэкст або тлумачыць змест' [1]. Вучні пачатковых класаў лепш запамінаюць тыя вобразы вывучаемага твора, якія бачылі ў графічным адлюстраванні, г. зн. ілюстрацыі канкрэтызуюць і ўзбагачаюць уяўленні вучняў такімі дэталямі, якія ім цяжка ўявіць

самастойна [2, 3]. Ілюстрацыйны матэрыял – важны кампанент школьнага падручніка "Літаратурнае чытанне". Ілюстрацыі дапаўняюць тэкставы матэрыял, даюць «падказку» вучням для ўспрымання мастацкага твора, фіксуюць праз зрокавы вобраз пэўныя прадметы, з'явы.

Мэта працы – прааналізаваць прыёмы працы з ілюстрацыйным матэрыялам пры вывучэнні мастацкіх твораў на ўроках літаратурнага чытання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**Матэрыял і метады.** У якасці матэрыялу для аналізу выкарыстаны падручнікі «Літаратурнае чытанне» для 2–4 класаў. Асноўным метадам даследавання з'яўляецца апісальна-аналітычны аналіз.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У навукова-метадычнай літаратуры вылучаюцца ілюстрацыі рэалістычнага візуальнага і сінтэзаванага візуальнага рада.

Ілюстрацыі выконваюць наступныя дыдактычныя функцыі:

– ілюстрацыя можа працаваць як тлумачэнне тэксту;

– ілюстрацыя можа замяніць асноўны тэкст, самастойна раскрыць змест вучэбнага матэрыялу; гэта садзейнічае развіццю ў школьнікаў аналітычных навыкаў, развівае ўменне складаць разгорнутае выказванне на аснове сціслага матэрыялу;

– ілюстрацыя заклікана дапамагчы выразіць думку, кампенсаваць тое, што цяжка выразіць словамі;

– ілюстрацыя можа дапамагчы вучню зразумець невядомыя словы, што абазначаюць прадметы і з'явы;

– вучэбная ілюстрацыя павінна выхоўваць пазітыўныя адносіны да жыцця, да навакольнай рэчаіснасці.

Месца ілюстрацыі на ўроку літаратурнага чытання ў пачатковай школе, прыёмы працы з ёю і заданні залежаць ад тэмы заняткаў, ад метадычнай задачы, спецыфікі вывучаемага твора. Праца з ілюстрацыяй павінна быць не выпадковым дыдактычным прыёмам, а дакладна прадуманым сістэмным элементам урока.

Выкарыстанне ілюстрацый на ўроках літаратурнага чытання садзейнічае павышэнню міжвольнага запамінання матэрыялу, мабілізацыі псіхалагічнай актыўнасці вучняў, павелічэнню аб'ёму матэрыялу, які засвойваецца малодшымі школьнікамі, развіццю цікавасці вучняў да ўрока.

На ўроках літаратурнага чытання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі выкарыстоўваюцца наступныя прыёмы працы з мастацкімі ілюстрацыямі да тэкстаў:

– гутарка па змесце ілюстрацыі ("Хто адлюстраваны на малюнку?");

– сумесны з вучнямі аналіз карцін з мэтай раскрыцця мастацкай блізкасці ілюстрацыі з вывучаемым літаратурным творам;

– пазнаванне вучнем герояў, рэчаў ("Пазнай, хто гэта", "Пакажы, дзе хто ці што"");

– аповед настаўніка па ілюстрацыі, карціне;

– разглядванне ілюстрацыі з мэтай адказу на пытанне;

– складанне апавядання па ілюстрацыі (пра героя, яго стан, настрой і г. д.);

– складанне пытанняў па ілюстрацыі;

– пераказ тэксту па серыі ілюстрацый;

– пераказ эпізода па ілюстрацыі;

– параўнанне ілюстрацый, рэпрадукцый карцін розных аўтараў з мэтай вывучэння спосабаў адлюстравання з'яў прыроды, вобразаў галоўных герояў;

– суаднясенне ілюстрацыі і тэксту (Знайдзі малюнак да наступных слоў…");

– ацэнка вучнем колеру намаляваных прадметаў, выразнасці жэста героя, размяшчэння фігур ("Чаму табе падабаецца гэты малюнак?");

– падбор загалоўка да ілюстрацыі;

– выбар цытаты да ілюстрацыі ("Якія словы падыходзяць да гэтага малюнка?");

– суаднясенне вобразаў на ілюстрацыі, у тэксце і музычным творы і г. д.

На ўроках літаратурнага чытання ілюстрацыйны матэрыял можа быць выкарыстаны на любым этапе ўрока.

На этапе падрыхтоўкі да ўспрымання мастацкага твора ілюстрацыі могуць быць асновай аповеду настаўніка пра гісторыю стварэння твора, паведамлення біяграфічных

звестак пра пісьменніка. Важна, каб аповед настаўніка не разыходзіўся па змесце з тымі ілюстрацыямі, якія ён прапануе малодшым школьнікам для разглядвання, так як вучням больш цікавае тое, што яны бачаць, тое, што адлюстравана.

Акрамя гэтага, на этапе падрыхтоўкі да ўспрымання мастацкага твора ў працэсе аналізу ілюстрацый можна актуалізаваць веды малодшых школьнікаў пра творчасць канкрэтнага пісьменніка. Напрыклад, перад чытаннем апавядання І. Муравейкі «Паўлік-будаўнік» (3 клас) можна вучням паказаць электронную выстаўку кніг аўтара. У працэсе разглядвання выстаўкі настаўнік арганізуе гутарку пра падзеі і герояў вядомых твораў, пра адносіны вучняў да гэтых твораў і тым самым падрыхтуе дзяцей да чытання новага твора гэтага аўтара.

Для актыўнага ўспрымання мастацкага твора можна выкарыстаць прыём прагназавання зместу твора па ілюстрацыі. Сутнасць гэтага прыёму ў тым, што да чытання тэксту вучні разглядаюць ілюстрацыю і выказваюцца наконт таго, што можа адбывацца ў гэтым творы, хто галоўны герой і г. д. Гіпотэзы абгрунтоўваюцца на асаблівасцях адлюстравання і потым правяраюцца ў працэсе чытання мастацкага твора.

На этапе аналізу літаратурнага твора па ілюстрацыях можна ўзнавіць паслядоўнасць падзей у тэксце, прасачыць змены паводзін і характар героя. Ілюстрацыі могуць стаць прычынай стварэння праблемнай сітуацыі. Для гэтага можна прапанаваць вучням суаднесці ілюстрацыю і тэкст, праверыць правільнасць подпісу да ілюстрацыі, выбраць больш дакладную ілюстрацыю да эпізода. Настаўніку важна арганізаваць аналіз і параўнанне ілюстрацый, дапамагчы малодшым школьнікам сфармуляваць самастойныя думкі, а не навязваць ім свае суджэнні. Педагог павінен ствараць на ўроку атмасферу вучэбнага супрацоўніцтва, дыскусіі, не каментаваць адказы вучняў падчас абмеркавання, так як усе выказаныя меркаванні школьнікаў каштоўныя і важныя. У выніку гэтага ў вучняў знікае страх памылкі, боязь, што іх меркаванне не адпавядае меркаванню настаўніка, актывізуецца пазнавальная дзейнасць.

**Заключэнне.** Такім чынам, ілюстрацыі з'яўляюцца важным сродкам матывацыі да чытання, паглыблення разумення малодшымі школьнікамі мастацкіх твораў. Неабходна падкрэсліць, што ілюстрацыя і яе разглядванне з'яўляюцца магутным каналам устанаўлення зваротнай сувязі паміж вучнямі і іх субяседнікам – пісьменнікам. Мэтанакіраванае і абгрунтаванае выкарыстанне ілюстрацыйнага матэрыялу ў працэсе вывучэння мастацкіх твораў садзейнічае літаратурнай адукацыі і асобаснаму развіццю вучняў пачатковых класаў.

1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / рад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – Мінск: БелЭн, 1996. – 784.
2. Биржевая, Т.А. Творческая деятельность на уроках литературного чтения во 2 классе / Т.А. Биржевая // Нач. шк. – 2011. – № 7. – С. 35–36.
3. Молодцова, Н.Г. Развитие у младших школьников способа понимать смысл зрительного образа / Н.Г. Молодцова // Нач. шк. – 2004. – № 4. – С. 87–93.

## ПРОБЛЕМА ФОРМИРОВАНИЯ ЦЕННОСТНОГО ОТНОШЕНИЯ К СЕМЬЕ У МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ

***Захарова Ю.А.,***
*магистрант 3 курса ХГУ имени Н.Ф. Катанова, г. Абакан, Российская Федерация*
*Научный руководитель –* ***Мирошниченко В.В.,*** *канд. пед. наук, доцент*

Ключевые слова. Ценности, ценности семьи, ценностное отношение, младший школьный возраст, взаимодействие.
Keywords. Values, family values, value attitude, primary school age, interaction.

Сегодня, когда в мире наступила информационная эра, стала резко меняться система человеческих ценностей, что, в свою очередь, ведет к изменению нравственных устоев. Особенно под воздействие этого процесса попадает молодое поколение, которое в наибольшей степени подвержено мировой цифровизации. Следствием этого у детей и